# У ФАРМАЦЕ ДРУЖБЫ І ДАВЕРУ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў на сустрэчы ў Мінску абмеркавалі беларуска-расійскія адносіны, інтэграцыйныя пытанні і міжнароднае становішча.**

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што зусім нядаўна беларуска-расійскія адносіны абмяркоўваліся ў Магілёве на пасяджэнні саюзнага Саўміна, а таксама ў час яго двухбаковай сустрэчы са старшынёй Урада Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым. «Мы ў сяброўскай атмасферы маглі абмеркаваць усе пытанні. Закрытых тэм у нас няма. У нас вельмі адкрытыя адносіны з прэм'ер-міністрам Расіі. Таму мы дастаткова ўважліва, наколькі гэта было магчыма ў тым фармаце, прагаварылі некаторыя пытанні», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт асабліва падкрэсліў якасны характар узаемадзеяння знешнепалітычных ведамстваў дзвюх краін. «Калі б у нас усе міністэрствы так узгаднена працавалі, напэўна, у нас не было б ніякіх праблем», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў Сяргею Лаўрову абмеркаваць будучыню беларуска-расійскіх адносін, інтэграцыю ў фармаце Еўразійскага эканамічнага саюза з улікам маючай адбыцца 31 мая ў Астане сустрэчы на самым высокім узроўні.

«Хацелася б пачуць вашыя ацэнкі і па некаторых міжнародных праблемах, асабліва па Украіне, Сірыі. Каб вы, можа быць, нават увялі мяне ў курс справы па некаторых падзеях апошняга часу, каб мы ведалі, як каардынаваць і карэктаваць сваю пазіцыю па тых ці іншых пытаннях», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу Аляксандр Лукашэнка адзначыў гатоўнасць таксама адказаць на ўсе пытанні. «У нас заўсёды з вамі абсалютна даверлівы і сяброўскі фармат размовы. У гэтым фармаце я гатовы абмеркаваць з вамі любыя пытанні», — сказаў Прэзідэнт.

«Мы сапраўды цалкам падзяляем канцэпцыю нашых адносін, якую вы зараз выклалі. Пытанні ўзнікаюць паміж любымі дзяржавамі, саюзнікамі. Але адрозненне нашых адносін у тым, што гэтыя пытанні мы сумленна ставім перад нашымі таварышамі, партнёрамі. І заўсёды разумеем адзін аднаго, хоць часам рашэнні шукаюцца не за адзін дзень», — падкрэсліў Сяргей Лаўроў.

Ён адзначыў рэгулярны фармат беларуска-расійскіх кантактаў як на двухбаковай аснове, так і ў шматбаковым фармаце. Міжнародная абстаноўка патрабуе цесная каардынацыі па пытаннях еўрапейскай бяспекі, сітуацыі ва Украіне, Сірыі і ў цэлым становішчы на Блізкім Усходзе. Міністр адзначыў важнасць беларуска-расійскага ўзаемадзеяння і ў розных міжнародных фарматах, у тым ліку ў ААН, АБСЕ, Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

Сяргей Лаўроў таксама абазначыў тэму недапушчэння гераізацыі нацызму і перапісвання гісторыі, важнасці сумеснага захавання памяці аб Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка і Сяргей Лаўроў на сустрэчы падрабязна абмеркавалі інтэграцыйную тэматыку, графік маючых адбыцца кантактаў на найвышэйшым узроўні, у тым ліку ў фармаце ЕАЭС у Астане, падчас трэцяга Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, пасяджэння кіраўнікоў дзяржаў СНД. У цэнтры ўвагі было і ўзаемадзеянне па лініі ЕАЭС-ЕС.

Асобна бакі спыніліся на тэме развіцця Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Еўразійскага эканамічнага саюза. Адзначана падабенства пазіцый у пытанні неабходнасці захавання і пераўтварэння СНД, каб гэтая структура была больш моцнай і дзейснай. Што тычыцца ЕАЭС, то ў перыяд беларускага старшынства ў 2015 годзе дасягнуты сур'ёзныя вынікі ў развіцці інтэграцыі. Разам з тым яшчэ застаюцца некаторыя пытанні, над вырашэннем якіх у цяперашні час працягваецца работа.

## Парламенцкі дзённік

# Па Шаўковым шляху

**Віктар Гумінскі прымае ўдзел у форуме «Адзін пояс, адзін шлях». Пра гэта інфармуе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў. Мерапрыемства праходзіць з 16 па 19 мая ў Ганконгу (Кітайская Народная Рэспубліка).**

Як паведамляе прэс-служба ніжняй палаты, мерапрыемства накіравана на садзейнічанне рэалізацыі праекта па стварэнні «Эканамічнага пояса Шаўковага шляху» і «Марскога Шаўковага шляху 21-га стагоддзя» і ўмацаванні партнёрскіх адносін паміж краінамі, праз якія яны праходзяць. Запланавана, што падчас мерапрыемства намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу нашай дзяржавы Віктар Гумінскі правядзе шэраг двухбаковых сустрэч.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## Меркаванне

Усебеларускі народны сход

# Талер маленькі, а залаценькі

### Як скарыстацца патэнцыялам невялікіх рэк?



**«Ёсць ідэя!» — неаднойчы ўжо чуў гэтую крылатую фразу ад чытача «Звязды», а таксама аўтара шэрагу публікацый у нашай газеце, жыхара Гродна, інжынера-будаўніка па спецыяльнасці Уладзіміра ЛОГАША. Вось якую праблему Уладзімір Міхайлавіч лічыць карысным абмеркаваць зараз, а магчыма, і на Усебеларускім народным сходзе.**

— Апошнім часам па радыё чуем шмат цудоўных, вельмі патрыятычных песень пра нашу родную Беларусь. У адной з іх гучыць: «На Беларусі Бог жыве». Так кажа наш просты народ. І вось пра што мне ў гэтай сувязі падумалася.

У нас больш за 20 тысяч рэк, 11 тысяч азёр. І ры гэтым які цудоўны ландшафт! Узгоркі і нізіны, так званыя тальвегі і водападзелы, лясы і пералескі. Паглядзець, напрыклад, на карту нашай Навагрудчыны. На самай навагрудскай горцы, на вышыні 330 метраў над узроўнем мора стаіць старажытны Навагрудак, і адтуль у розных напрамках сцякае каля дзясятка ручайкоў і рэчак. І ўсе яны таропка, з вялікім, да 150 метраў перападам на радыусах накіроўваюцца да бацькі-Нёмана. Нашымі далёкімі продкамі, ды і на нашай памяці з вялікай карысцю выкарыстоўваўся энергетычны патэнцыял гэтых рэчак і заадно ствараліся ўмовы для развядзення рыбы, гадаваліся вадаплаўныя птушкі і іншая жыўнасць. На невялікіх па плошчы штучных азёрах на Гродзеншчыне калісьці было больш за сотню млыноў. Плюс там можна было выдатна адпачыць. Так бы мовіць, талер маленькі, а залаценькі.

Гідрагеалогія тут такая, што акрамя ліўневых водаў, усе рачулкі добра сілкуюцца з крыніц, якія б'юць з-пад зямлі. Нездарма вада ў гэтых мясцінах халодная і, у адрозненне ад рэчак Прыпяцкага басейна, дзе ўжо шмат гадоў таму прыжыліся карп і таўсталобік, добра жыве фарэль. Тут варта ствараць фарэльныя гаспадаркі, тым больш, што Гарацкая сельгасакадэмія адназвала тэхналогію вырошчвання гэтай каштоўнай рыбы.

Выкарыстанне патэнцыялу малых вадаёмаў, на мой погляд, магчыма найперш у цеснай сувязі з развіццём аграсядзіб, фермерскіх гаспадарак. Тут патрэбны дзяржаўны падыход і комплексная праграма, якая ўлічвала б усе аспекты гэтай справы. Што маю на ўвазе? Трэба на дзяржаўным узроўні стварыць генеральную схему размяшчэння аграсядзіб і фермерскіх гаспадарак у раёне малых вадаёмаў. Пры гэтым прадугледзеўшы і выкарыстанне іх энергетычнага патэнцыялу (устаноўка агрэгата для выпрацоўкі электраэнергіі), у чым павінны быць зацікаўлены дзяржаўныя энергетычныя структуры і мясцовыя ўлады), і развядзенне рыбы, птушкі, іншай дамашняй жыўнасці, і стварэнне базы адпачынку, нармальных пад'язных шляхоў і, зразумела, пытанні экалагічнай бяспекі.

Канешне, зрабіць гэта асобнаму гаспадару аграсядзібы ці фермеру нерэальна. Але ў нас ёсць магутныя архітэктурныя сілы (той жа праектны інстытут «Белдзіправодгас»), якія ў стане стварыць такую генеральную схему. А ажыццяўляцца яна, мяркую, можа па прыкладзе жыллёвага будаўніцтва, калі ўзводзяцца дамы і затым кватэры без тых жа шпалераў, пабелкі прадаюцца людзям і яны самі ўсё даводзяць да ладу. Так і тут: дзяржава вырашае асноўныя інфраструктурныя пытанні ў раёне малых рэчак, а затым прапануе ініцыятыўным людзям распачаць на гэтай аснове сваю справу. Напрыклад, маладым сем'ям (скажам, муж па спецыяльнасці — энергетык, а жонка — аграном), выпускнікам ВНУ.

Цікава, што думаюць на гэты конт іншыя чытачы «Звязды», спецыялісты ў сферах, пра якія ідзе гаворка?

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

## Сацыяльны клопат

# ПРАПАГАНДА САЛАТЫ І ГІМНАСТЫКІ

### Валанцёры Чырвонага Крыжа будуць прывучаць беларусаў да здаровага ладу жыцця

**Гэты кірунак арганізацыя пачала развіваць з мінулага года. «Пакуль што ахоплены толькі тры вобласці — Віцебская, Гродзенская, Магілёўская. Мы хацелі б распаўсюдзіць вопыт па прапагандзе здаровага ладу жыцця і на іншыя рэгіёны», — адзначыла намеснік генеральнага сакратара Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Іна ЛЕМЯШЭЎСКАЯ.**

Каб заахвоціць насельніцтва клапаціцца пра сваё здароўе, арганізацыя выпускае буклеты і паказвае па тэлебачанні ролікі, дзе расказвае аб правільным харчаванні, неабходнасці рухальнай актыўнасці, прафілактыцы неінфекцыйных захворванняў. Рыхтуюць і валанцёраў, якія будуць «у тэме». «Хочам, каб кожны валанцёр меў хоць бы трох падапечных, для якіх складаў бы план, як палепшыць самаадчуванне», — заўважае Іна Лемяшэўская.

Сёлета Беларускі Чырвоны Крыж прыме чарговую стратэгію дзеяння на наступныя пяць гадоў. Асноўным клопатам арганізацыі застанецца дапамога найбольш уразлівым катэгорыям грамадзян: адзінокім пенсіянерам, інвалідам, хворым і іх блізкім, шматдзетным сем'ям. Цяпер у краіне працуе 147 сясцёр міласэрнасці. На кожную прыпадае да дзесяці падапечных, якія трэба наведваць кожны тыдзень. Усяго медыка-сацыяльную дапамогу дома атрымліваюць каля тысячы чалавек.

— Вядома, гэта лічба вельмі маленькая. Тых, хто мае патрэбу ў доглядзе, нашмат больш, — кажа намеснік генеральнага сакратара таварыства. — Каб пашыраць сетку сясцёр міласэрнасці, мы працуем у рамках дзяржаўна-сацыяльнага заказу і выкарыстоўваем мясцовае фінансаванне. За кошт гэтых сродкаў аплачваем 63 стаўкі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# МАЦІ, ДЗЯЎЧЫНА І АЙЧЫНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А вось Акім Лепеш, які ідзе служыць ва ўнутраныя войскі, на грамадзянскую службу вяртацца не спяшаецца. Калі пашанцуе, то затрымаецца ў органах дзяржаўнай бяспекі. У армію пайсці марыў яшчэ падлеткам. Рыхтаваўся загадзя. Нягледзячы на тое, што Акім усё жыццё займаецца спортам, перад арміяй трэніраваўся ва ўзмоцненым рэжыме.

— Для мяне ж галоўнае, каб армія зрабіла з мяне сапраўднага мужчыну, — лічыць юнак.

Цімафей Асокін таксама не з тых, хто здзівіўся павестцы. І з тых юнакоў, якія ідуць служыць менавіта туды, куды хацелі. Але каб трапіць у 56-ы асобны полк сувязі, аднаго жадання недастаткова. І Цімафей гэта добра ведаў. Пасля курсаў пры ДТСААФ сябруе і з азбукай Морзэ, і з іншымі спосабамі знакавага кадзіравання.



І Мікіта Пуцейка ідзе служыць ужо з патрэбнымі ведамі. З адукацыяй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі юнаку будзе рада любое воінскае злучэнне. Хлопцу пашчасціла: служыць будзе амаль што дома — у 120-й асобнай механізаванай брыгадзе.



Фота Надзеі БУЖАН.

Побач з многімі прызыўнікамі — талака сваякоў і сяброў. Пакуль будучы сувязіст Іван, які стаіць у акружэнні бацькоў, бабулі з дзядулем, сяброў і дзяўчыны, якая абяцала дачакацца хлопца з арміі, слухае апошнія настаўленні, яго маці, Таццяна Васільева, кажа: «Мы спадзяёмся, што ў нашай арміі выхаваюць добрага, мужнага і смелага чалавека».

...Бацькі, сваякі і сябры развітваюцца са сваімі прызыўнікамі. Наступны раз яны ўбачацца праз месяц, падчас цырымоніі прыняцця ваеннай прысягі новым папаўненнем, якая адбудзецца ў лучэннях і воінскіх часцях Узброеных Сіл 11 чэрвеня. За гэты перыяд іх колішнія прызыўнікі ператворацца ў сапраўдных вайскоўцаў, здольных годна стаяць на варце міру і спакою краіны.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*